# ГІСТОРЫЯ, ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ ТЭХНАЛОГІІ ВЫШЫЎКІ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

*Г.А. Бабровіч, Н.А. Бабровіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Арнаментацыя тканін спосабам вышыванняў мела значнае развіццё паўсюдна на Беларусі ў канцы XIX – XX стагоддзях. Вышыўка з'яўлялася адным з асноўных тэхнічных прыёмаў упрыгожвання адзення, галоўным чынам жаночага: кашуль, галаўных убораў, фартухоў. Ёй арнаментавалі таксама мужчынскія кашулі, прадметы бытавога ўжытку – ручнікі, абрусы і інш.

Мэта даследавання: аналіз гісторыі развіцця тэхналогіі вышыўкі, на Віцебшчыне з моманту яго ўзнікнення і да сучаснасці, выяўленне характэрных асаблівасцяў гэтага працэсу.

**Матэрыял і метады.** Метады даследавання былі абумоўлены пастаўленнымі мэтамі і задачамі, для вырашэння якіх спатрэбілася сумаваць, сінтэзаваць спецыяльныя гістарычныя і мастацтвазнаўчыя веды з дасягненнямі ў галіне філасофіі, гісторыі і тэорыі культуры, этналогіі, семіётыкі, эстэтыкі, педагогікі і інш. Параўнальна-гістарычны, лагічны, класіфікацыйны, апісальны, эмпірычны, рэтраспектыўны, структурна-функцыянальны, семантычны і г.д. – усе гэтыя метады ў працы прадстаўляюцца як сінтэтычныя, інтэгратыўная спосабы (якія ўзніклі як выніку спалучэння элементаў розных узроўняў метадалогіі) у рамках даследавання вышыўки, як часткі культуры. У вопыце таксама ўжываўся метад эксперыменту, назірання, апытанне-праца з інфарматарамі, фіксацыя атрыманых матэрыялаў (відэаздымка, фатаграфаванне). Матэрыялам даследавання паслужылі творы народных майстроў

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Вышыўка – адзін з відаў народнага мастацтва, у якім здаўна панавала жаночая праца. Практычнае навучанне пачыналася з дзіцячых гадоў ад маці дачцэ. Гэта абумовіла бесперапыннае пераймание творчых навыкаў папярэдніх пакаленняў. Вышыванне існавала галоўным чынам у форме хатняга занятку – вытворчасць у хатніх умовах для ўласных патрэб. У асобных выпадках вышыўка з'яўлялася сродкам дадатковага заробку. Так, у 1907 годзе вышывальным і карункавым промыслам займаліся жанчыны і падлеткі ў 24 дварах в. Кішкі Латыгаўскай воласці Сенненскага павета (цяпер в. Машчоны Віцебскай вобл.) [1].

Матэрыялам (асновай) для вышывання з'яўляліся льняныя, суконныя, баваўняныя і змешаныя тканіны хатняга і фабрычнага вырабу. Для вышыўкі выкарыстоўвалася галоўным чынам ільняная двухнітовая тканіна палатнянага перапляцення. Самае тонкае адбельнае (кужэльнае) палатно ішло на ручніковыя галаўныя ўборы (наміткі). Таксама з кужэльных, але больш тоўстых тканін шылі святочныя кашулі, фартухі. Узоры традыцыйнага адзення сведчаць аб мінулым панаванні геаметрычных арнаментаў. У рукапісным дыярыўшы падарожжа ў 1797 годзе ў Пецярбург ёсць вельмі значнае ўдакладненне аб колеры старажытных докшыцкіх арнаментаў: "У мясцовым наваколлі сяляне носяць кашулі, аздобленыя вышыўкай з чырвоных і блакітных нітак".

Старажытны прыём арнаментацыі верхняга суконнага адзення – расшыванне шарсцяным шнуром. На Віцебшчыне апрача абшывання сінім шнуром выкарыстоўвалі аплікацыю тонкай скурай у выглядзе зубчастых і ажурных узораў для ўпрыгожвання жаночых аўчынных кажухоў.

Здаўна выкарыстоўвалася ў вышыўцы на ручніках двухбаковае шыццё роспісам, хаця шырокае распаўсюджанне для яго не характэрна. Чырвонай бавоўнай выконвалі старажытныя міфалагічныя сюжэты з дрэвам жыцця, птушкамі, характэрнымі антрапаморфнымі персанажамі. Вышыўка мела від тонкіх ліній, якія стваралі на вонкавым і адваротным баках аднолькавы ўзор. Выконвалася яна двухразовым ходам рабочай ніткі швом "уперад іголку": першы раз намячалі контуры ўзору, зваротным ходам дапаўнялі прапушчаныя месцы.

Асаблівасцю ажурнага строчавага шыцця з'яўляецца папярэдняе выцягванне нітак асновы ці ўтка або тых і другіх. Для мярэжак выцягваюць падоўжныя ніткі, а на папярочных ствараюць адпаведны ўзор. Строчка-пярэвіць (перавіўка) заснавана на перавіванні папярэдне падрыхтаванай сеткі і наступнай яе арнаментацыі. З'явілася ў Італіі ў эпоху Рэнесансу ў XV–XVI стагоддзях Белай строчкай-пярэвіццю ўпрыгожвалі абрусы, канцы ручнікоў. Значная колькасць падобных узораў зафіксавана на тэрыторыі Віцебшчыны, шырокае выкарыстанне белай

Репозиторий ВГУ

строчкі-перавіўкі з характэрнымі ўзорамі ў выглядзе антрапаморфных, арнітаморфных выяў, матываў пышнай расліннасці абумоўлена ўплывам вышыўкі рускай Поўначы. [1]

Вышыўка ў тэхніцы адвольнай аднабаковай і двухбаковай гладзі з дадатковымі дэкаратыўнымі швамі “козлік”, “касічка”, “пляцёнка” і інш. з другой, пасляваеннай паловы XX стагоддзя набывае папулярнасць як хатняе рукадзелле маладых дзяўчат, але да раслінна-геаметрычных узораў, якія друкаваліся ў часопісах і дапаможніках па вышыўцы тых часоў, яшчэ прадаўжае далучацца апавядальнасць сімвалічных зааморфных і арнітаморфных сюжэтаў з традыцыйным сімвалічна-міфалагічным гучаннем.

Зусім па-іншаму гучыць вядомая старажытная тэхніка вышыўкі працягам (наборам), якая набывае вясёлкавую шматколернасць і новы канвовы фон замест ільняной даматканкі.

Як у вясковым, так і ў асяродку невялічкіх гарадскіх пасёлкаў (былых мястэчкаў) вышыванне існуе як від сучаснага рукадзелля і ў форме аўтэнтычнага бытавання даўно страціла свае адметныя арнаментальныя і мастацка-тэхналагічныя традыцыі, якія былі ўласцівы сялянскай культуры рэгёна на пачатку XX стагоддзя. Страціўшы аўтэнтычны ход існавання і прамую пераемнасць ад маці дачушцы з дзяцінства ў асяродку сялянскай хаты, ніткападобныя парасткі вясковых традыцый ўсё ж такі прабіліся праз надышоўшае ліхалецце і пачалі расквітаць зноў на якасным жыццяздольным узроўні існавання з пачатку 1980–90-х гадоў у створаных дзяржаўнымі ўладамі спецыфічных установах культуры – Цэнтрах і Дамах рамёстваў. Сучасныя майстры сталі шукаць, зберагаць і вывучаць мастацкія каштоўнасці рэгіянальнага вышыванага тэкстылю, іх своеасаблівыя лакальныя адметнасці, рэканструяваць старажытныя прыёмы і тэхнікі вышыўкі, ствараць магчыма дакладныя рэплікі тых традыцыйных артэфактаў з вышытымі арнаментамі, што захаваліся ў музейных фондах ці засталіся цудам ў спадчыну нашчадкам.

Разам з аднаўленнем і новым будаўніцтвам, у тым ліку і на Віцебшчыне, праваслаўных і каталіцкіх храмаў, з ростам цікаўнасці народа да хрысціянскай рэлігіі ў апошнія гады значную папулярнасць набывае хатні выраб абразоў у шматлікіх тэхніках каляровай вышыўкі як рознымі па якасці ніткамі, так і бісерам. У бытавым вясковым і гарадскім асяродку разам з вялікай цікаўнасцю да хрысціянскіх сюжэтаў застаецца імкненне да вышывання карцін па друкаваных малюнках і штучных купонах з наборамі неверагоднай колькасці матэрыялаў і сюжэтаў “дамскага рукадзелля”.

Цудоўны свет майстэрства вышыўкі дазваляе жанчынам адчуваць вялікую асалоду творчасці і ствараць прыгожыя рэчы для аздаблення сваіх інтэр’ераў, душэўныя падарункі сваякам і знаёмым. Хатняе захапленнне вышыўкай прыводзіць многіх майстрых да асабістых творчых выставак ці пастаяннага ўдзелу ў кірмашах народнай творчасці.

Клубы народных майстроў пры Дамах (Цэнтрах) рамёстваў сабралі колы зацікаўленых аматараў вышыванак, якія дагэтуль нават і не ведалі адзін аднаго, паасобку займаючыся любімым заняткам у хатніх умовах.

У ліпені 2008 года на абласное свята-конкурс вышыўкі і карункапляцення “Чароўная нітка” падчас Міжнароднага фестывалю “Славянскі базар у Віцебску” з’ехаліся дзясяткі майстроў з усіх раёнаў вобласці, дзе здолелі здзівіць і гледачоў, і кампетэнтнае журы на чале з доктарам мастацтвазнаўства, прафесарам, старшынёй Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці Я.М. Сахутам высокім узроўнем выканання, ведамі традыцый і мастацкім густам сваіх сучасных вышыванак.



Мал. 1 – Панарама віншавання ўдзельніц абласнога свята-конкурсу вышыўкі і карункапляцення “Чароўная нітка” ў Цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў “Дзвіна” на кірмашы народных рамёстваў і мастацтваў “Горад майстроў” у Віцебску.



Репозиторий ВГУ

**Заключэнне.** Паслядоўна развіваючыся на працягу стагоддзяў, вышыўка і ў нашы дні застаецца на Віцебшчыне адным з найбольш папулярных і пашыраных відаў самадзейна-аматарскай і народнай мастацка-майстэрскай творчасці.


Спіс выкарыстаных крыніц

1. Лабачэўская, В.А. Асаблівасці народных тканін Віцебшчыны // Культурная спадчына Беларусі, Віцебская вобласць: традыцыйны народны тэкстыль / [Т.Б. Варфаламеева і інш.]. Мн.: заданне № 3 "Распрацаваць тэарэтыка-метадалагічную і прадметна-практычную базу для правядзення комплексных фальклорна-этнаграфічных даследаванняў лакальных культур і стварыць на гэтай аснове эксперыментальныя ўзоры мультымедыйных анталогій народнай творчасці" галіновай навукова-тэхнічнай праграмы "Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гадоў ("культура")". – Мн.: Электр. дыск, 2011.


## ТЕХНОЛОГИИ РЕСТАВРАЦИИ ХУДОЖЕСТВЕННЫХ ИЗДЕЛИЙ ИЗ ДРЕВЕСИНЫ В ОБУЧЕНИИ СТУДЕНТОВ ХУДОЖЕСТВЕННО-ГРАФИЧЕСКИХ ФАКУЛЬТЕТОВ


*Д.И. Будич, Ю.П. Беженарь*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


В настоящее время предпринимаются активные действия по развитию народных художественных промыслов, по улучшению организации обучения художников и мастеров на предприятиях, ведется работа по передаче опыта мастеров старшего поколения младшему. Но глобализационные процессы рубежа XX–XXI вв. послужили причиной неустойчивости мультикультурных отношений, размытости этнической идентичности человека; это привело к трагическим для отрасли последствиям: исчез целый ряд производств изделий народного искусства; утрачены технологии реставрации изделий знаменитых мастеров; ослабел общественный интерес к традиционной национальной культуре.

Претерпевшая трансформацию образовательная сфера не справляется с задачами обучения и воспитания активной, творческой личности и формирования у нее общечеловеческих, культурных, национальных и эстетических ценностей. Принципы обучения основам традиционной культуры, сформировавшиеся в среде народных мастеров, незаслуженно перестали пользоваться спросом, особого внимания требует проблема возрождения культуры труда, решаемая в ходе комплексного освоения отечественного культурного наследия.

Сказанное выше определяет актуальность исследования, которая состоит в необходимости реконструкции традиционных основ национальной культуры, народных форм обучения декоративно-прикладному искусству как факторов воспитания и социализации личности, развития у молодого поколения умений и навыков реставрации художественных изделий из древесины на основе исследования опыта традиционных технологий реставрации известных мастеров, с учетом современных материалов для отделки, реставрации, консервирования.

**Материал и методы.** В исследовании в качестве рабочего материала использовались: образовательный стандарт Республики Беларусь специальности 1-03 01 06 – Изобразительное искусство, черчение и народные художественные промыслы (30 августа 2013 г. № 87), а также учебная программа «Технология обработки материалов».

Реализованы методы исследования общенаучного характера (применение логических приемов сравнения, анализ, обобщение), теоретический анализ научно-технической и методической литературы по технологии художественной обработки древесины и ее реконструкции.

**Результаты и их обсуждение.** Обучение студентов технологиям реставрации и художественной обработке древесины обладает значительными образовательными и воспитательными возможностями: развивает технологическую культуру, способствует эстетическому и творческому развитию личности, более успешной самореализации, профессиональному самоопределению. Овладение технологиями художественной обработки древесины, будущим учителем трудового обучения и методикой грамотного обучения школьников обеспечивает необходимую социальную защищенность педагога, его конкурентоспособность на рынке труда, возможностью заниматься предпринимательской деятельностью в области реставрации художественных изделий.

Учебной программой «Технология обработки материалов» предназначенной для студентов художественно-графического факультета ВГУ имени П.М. Машерова, специальности 1-03 01 06 – Изобразительное искусство, черчение и народные художественные промыслы, предусмотрено рассмотрение вопросов о: видах ремонта и реставрации; основных повреждений изделий (отслаивание или разрушение шпона, излом деталей, истирание деталей, разрушение клея, коробление деталей,

Репозиторий ВГУ